ISSN 0321-1649 (print)
УДК 821.161.3:398.5 Я. Баршчэўскі

Паступіў у рэдакцыю 23.02.2016
Received 23.02.2016

**Л. П. Леська**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь*

# МІФАЛАГІЧНЫ ЎРБАНІЗМ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА

Формулируются определения авторского мифа о городе как о созданной автором по установленным им самим законам художественной правде, новой реальности, которая моделируется согласно законам мифологического сознания и городской мифологии (представленной народными преданиями о необыкновенных моментах истории города, его жизнедеятельности, его жителях и пространстве, где город воспринимается как целостный, живой, культурный организм).

Город в художественной трактовке Я. Борщевского – амбивалентный образ, символическая многозначность которого раскрывается автором посредством использования библейских представлений о городе-Рае, городе-Пекле и городе-Чистилище.

Исследовано, что архетипические моменты библейской истории, как и языческие представления белорусов, трансформированы в авторском мифологизировании, их использование способствует осознанию несовершенства современного положения в мире и восприятию надежды на новое обновление, которое мыслится писателем не как создание нового, а как возвращение к первоначальной гармонии.

Выявляется, что обновление в городском мифе Я. Борщевского, с одной стороны, связано с идеей утопического возвращения Золотого Века, переплетается с верой в натурального человека, в натуральное хозяйство, а с другой – раскрывается в непоследовательных авторских надеждах на город как центр просвещения, высокой культуры и духовности. Подчеркивается, что в городской мифологии Я. Борщевского ключевым является мотив потери исторической памяти, что стало признаком деградации и закономерно предшествует концу истории города, является составной частью эсхатологических мифов, но трагизм эсхатологической тематики городских мифов облегчается мотивом цикличности, обновления.

Эсхатология в городской мифологии и утопия в авторском мифе о городе определены как выражение идеи цикличности. Выявляются отличительные черты мировидения писателя.

*Ключевые слова:* белорусская литература XIX века, миф, мифология, мифотворчество, белорусский национальный миф, городская мифология, эсхатология, утопия, обновление, идеализация.

**L. P. Leska**

*Belarusian Maxim Tank State Teachers-Training University, Minsk, Belarus*

## JAN BARSZCZEWSKI'S MYTHOLOGICAL URBANISM

The article defines the authorial myth about the city as an artistic truth which is created by the author according to his own laws, and a new reality which is modeled according to the laws of mythological consciousness and urban mythology (represented by folk legends about wonderful moments in the history of the city, its life, its inhabitants and its space, where the city is perceived as a holistic, living cultural body).

According to Jan Barszczewski's artistic interpretation, the city is an ambivalent image; its symbolic ambiguity is disclosed by the author through the use of the biblical concepts of the city of Paradise, the city of Hell and the city of Purgatory.

It is revealed that archetypal moments of the biblical history as well as Belarusians' pagan ideas are transformed in the authorial myth; their use contributes to the understanding of the imperfections of the current situation in the world and to the perception of hope for a renewal which is conceived by the writer not as creating something new, but as returning to the original harmony.

On the one hand, the renewal in Jan Barszczewski's urban myth is connected with the idea of a utopian return of the Golden Age and is intertwined with the belief in the man of nature and in a subsistence economy; on the other hand, the renewal is manifested in the author's inconsistent hopes for the city as a center of education, high culture and spirituality. It is emphasized that the key motif in Jan Barszczewski's urban mythology is the loss of the historical memory, which is a sign of degradation and naturally precedes the end of the history of the city; it is part of eschatological myths, but the eschatological in the urban myths is made less tragic through the motifs of cyclic recurrence and renewal.

The article defines eschatology in urban mythology and utopia in the authorial myth of the city as an expression of the idea of cyclic recurrence. The distinctive features of the writer's worldview are identified.

*Keywords:* Belarusian literature of the 19th century, myth, mythology, mythmaking, Belarusian national myth, urban mythology, eschatology, utopia, renewal, idealization.

© Леська Л. П., 2017

Міфатворчасць Яна Баршчэўкага даследуецца даўно. Адным з першых да гэтай праблемы звярнуўся Р. Падбярэскі і слушна патлумачыў: “Тое, што піша п. Баршчэўскі прозай, не датычыцца прама ні гісторыі, ні літаратуры, ні мовы Беларусі, але рэчы найбольш важнай, а менавіта духу і паэзіі народа, адкуль выйшлі і гісторыя, і літаратура, і мова” [1, с. 69]. Магчыма, пад тым таямнічым і містычным “духам” крытык падразумяваў міфалогію, якая, паводле тлумачэнняў М. Гарэцкага, актыўна завабіла Яна Баршчэўскага: “Задалося пісьменніку пераняцца містычным настроем забабоннага беларуса, каторы тады меў вялікую веру ў сілу чараўнікоў, у нячысцікаў і паэтычна бачыў у жывой і нежывой прыродзе living страхаццё” [2, с. 176].

Пільная ўвага Я. Баршчэўскага да міфалагічных матываў і іх мастацка-практычнае развіццё ў сучаснай літаратуры, на думку В. Каваленкі, “з’яўляюцца глыбока ўнутранай эстэтычнай рэакцыяй творчых сіл на недаацэнку мастацкай культуры мінулага ў пэўны перыяд духоўнага развіцця нашага грамадства” [3, с. 4].

Довады В. Каваленкі падзяляў і М. Хаўстовіч, які высока ацаніў міфапаэтычную спадчыну пісьменніка і патлумачыў, што: “у 40-я гады рост нацыянальнай самасвядомасці выявіў сябе якасна новаю з’яваю – стварэннем беларускага нацыянальнага міфа. Вучоны прапанаваў “прачытаць беларускі міф у творах Яна Баршчэўскага” [4, с. 65], які, на думку даследчыка, “не проста выкарыстанне міфалагічна-фальклорных элементаў беларускае архаікі, а ўдалая спроба стварыць міфалогію, стварыць міф з усімі яго структурнымі кампанентамі” [4, с. 65]. Прапанова М. Хаўстовіча была падтрымана айчыннымі навукоўцамі[1]. С. Даніленка грунтоўна даследаваў рытуальную аснову аўтарскай міфатворчасці, прасачыў фарміраванне і станаўленне сацыяльнага міфа на матэрыяле твораў Яна Баршчэўскага [5]. С. Тычына раскрыла таямніцы міфапаэтыкі сну ў мастацкім свеце пісьменніка [6].

Нягледзячы на значныя набыткі ў вывучэнні міфатворчасці Яна Баршчэўскага, *міф пра горад і міфалогія гарадоў* у творах пісьменніка не сталі прадметам асобнага даследавання, хаця ўрбаністычная тэма распрацоўвалася ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Адам Міцкевіч, Ян Чачот і Тамаш Зан, паводле сведчання І. Багдановіч, “скарысталі дзве сюжэтныя версіі, звязаныя з двума палярнымі архетыпамі возера – горад” [10, с. 16], і стварылі персанальныя міфы пра горад Свіцязь. Ян Чачот у баладзе “Радзівіл, альбо заснаванне Вільні” прадставіў міф пра Вільню, а ў баладзе “Наваградскі замак” паэт узнавіў гістарычнае мінулае Наваградка, Тадэвуш Лада-Заблоцкі займаўся міфалагізацыяй гісторыі Віцебска (Паэма “Ваколіцы Віцебска”).

Ян Баршчэўскі, працягваючы традыцыі філаматаў, таксама стварыў міф пра Полацк і Пецярбург, прадставіў міфалагенныя гісторыі пра Невель, Віцебск, Расоны, Пскоў і Вялікія Лукі.

Задача дадзенага артыкула – вызначыць генетычныя вытокі гарадской міфалогіі і аўтарскай міфатворчасці, ахарактарызаваць асноўныя аспекты аўтарскага міфа пра горад, асэнсаваць яго сімволіка-семантычную шматзначнасць.

Мэтазгоднасць і актуальнасць нашага даследавання аргументуюцца довадамі, якія прыводзіць А. І. Бельскі ў артыкуле “О, горада, чароўныя прынады!” Станаўленне ўрбаністычнага мыслення ў беларускай паэзіі” [8]. Вучоны ўпершыню ў беларускай навуцы разгорнута і дакладна прасачыў развіццё ўрбаністычнага мыслення ў беларускай паэзіі XIX стагоддзя, адзначыўшы, што “раней беларуская крытыка больш паслядоўна вывучала гарадскую тэму на матэрыяле беларускіх твораў XX стагоддзя” і цяпер наспеў час звярнуцца да гэтай праблемы на матэрыяле мастацкіх тэкстаў XIX стагоддзя. “У паэзіі XIX стагоддзя – як польскамоўнай, так і ўласна беларускамоўнай – прасторавыя каардынаты, – паводле тлумачэнняў вучонага, – немагчыма ўявіць без урбаністычнай тапаніміі” [8, с. 4], што непасрэдна мае дачыненне, па нашым меркаванні, і да празаічнай спадчыны Яна Баршчэўскага. Пісьменнік у зборніку “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, у баладах, у аповесцях “Кабета Інсекта”, “Душа не ў сваім целе” і ў лістах да Юліі Корсак звярнуўся да міфалагізацыі горада, у якой вылучаюцца два аспекты: *аўтарскі міф пра горад і народныя паданні, якія сталі асновай гарадской міфалогіі.*

[1] Да міфалагічнай спадчыны пісьменніка ў розныя часы звярталіся В. Каваленка, Н. Перкін, А. Мальдзіс, У. Мархель, М. Хаўстовіч, С. Даніленка, А. Макарэвіч, С. Тычына, В. Бароўка, І. Штэйнер.

У сувязі з гэтым неабходна ўдакладніць, што *міф* пра горад у дадзеным артыкуле разглядаецца намі як "*створаная аўтарам па ўстаноўленых ім самім законах мастацкай праўды новая рэальнасць, якая мадэлюецца ў адпаведнасці з законамі старажытнай свядомасці*" і [9, с. 5] успрымаецца і як спецыфічная форма мастацкага мыслення, і як мадэль для перастварэння свету.

Вынік аўтарскай міфатворчасці ідэйна-тэматычна і канцэптуальна звязаны з гарадской міфалогіяй, або з "*эмацыянальна-афарбаванымі калектыўнымі і індывідуальнымі, нейкім чынам агучанымі, уяўленнямі пра актуальныя для носьбітаў міфа незвычайныя моманты гісторыі горада, яго жыццядзейнасці, пра жыхароў і гарадскую прастору, дзе горад асэнсоўваецца як цэласны, жывы культурны арганізм*" [9, с. 6]. Як у аўтарскім міфе, так і ў гарадской міфалогіі вылучаецца канцэпцыя цыклічнасці і адраджэння. Увасабленнем ідэі цыклізму становяцца эсхаталогія[2] у гарадской міфалогіі і ўтопія ў аўтарскіх міфах пра горад.

У гарадскіх міфах, якія, паводле слоў аўтара, шырока бытуюць у ваколіцах Полацка і паблізу возера Нешчарда, прасочваецца перакананне, што першай прыступкай у адраджэнні горада стала яго знішчэнне, прыклад якога падаецца ў "Нарысе Паўночнае Беларусі": "Страшны волат, якога звалі Княжа, прываблены да берагоў Нешчарды надзеяй на багаты рабунак, аблажыў з велізарнаю хеўраю гэты горад" [10, с. 84], абрабаваў яго, жыхароў забіў, святыні зруйнаваў, а званы затапіў у возеры. Але Бог абвясціў сваю кару блюзнерцам: "Апоўначы лятала чума, падобная да чорнага шара, і дзе дакранулася да сцяны, з гэтага дому ніхто не выходзіў жывы, і такім чынам вымерла ўся дружына Княжа" [10, с. 85]. Сам захопнік хацеў уцячы, але яго напаткала смерць. Народ і зараз паказвае аграмадны курган, які называецца Магілай Княжа" [10, с. 85]. У міфічнай гісторыі невядомага горада ключавымі з'яўляюцца моманты знішчэння і абнаўлення. Калі пра разбурэнне горада непасрэдна апавядаецца, то момант яго абнаўлення бачыцца ў тым факце, што невядомы горад стаў святым месцам, дзе загінулі бязвінныя ахвяры. Святасць – патэнцыял адраджэння, якое ўжо прадчуваецца ў аўтарскім апісанні-ўдакладненні: "На паўднёвым баку возера Нешчарда ёсць гара, якую з трох бакоў амывае вада, на той гары – *драўляны касцёлак і некалькі хвояў.* Там часта знаходзяць у пяску сцёртыя вякамі срэбныя манеты, шкляныя аздобы, якія насілі бабулі нашых бабуль, іржавыя рэшткі разнастайнае старасвецкае зброі. Кажуць на той паўвыспе быў некалі горад"… [10, с. 85].

У адзіна ацалелым касцёлку, вобраз якога стаў зыходным пунктам зараджэння новага міфа, па нашым меркаванні, увасоблена выключная сакральнасць, жывучасць веры (нездарма будыніна стаіць у атачэнні жыццядайных хвоек). Надзею на новы росквіт горада тоіць і велічная гара, непадалёк ад якой размяшчаўся разбураны горад. Вобраз гары ў міфалагічных даведніках трактуецца "як сімвал вечнасці, накіраванасці і духоўнага пад'ёму" [11, с. 94].

Алюзія на адраджэнне горада вылучаецца ў сімвалічна-вобразнай сістэме апавядання "Таварыш у падарожжы". Тут аўтар прыгадаў паданне, як быў разбураны горад, а праз некалькі стагоддзяў на яго месцы размясціўся маёнтак пана Дамініка і ў пэўны час там правалілася зямля і ўтварылася яма. Пан Дамінік, думаючы, што ў падземных сховах будуць скарбы, прымусіў туды спусціцца селяніна, які ў апраметных сховах убачыў кабету, што спала на крэсле, "яе чорны ўбор быў знакам цяжкае жалобы, ля яе ног спалі велізарныя і страшныя мядзведзі. І яшчэ Дамінікаў пасланец бачыў незлічоныя скарбы ў адчыненых жалезных скрынях" [10, с. 248]. Духоўная веліч і матэрыяльнае багацце зруйнаванага горада схавана далёка пад зямлёю, перад тагачаснымі жыхарамі раскрыта толькі яма, вобраз якой мае два сімвалічныя значэнні. З аднаго боку, яма-знак бездухоўнасці і маральнага заняпаду тагачаснага грамадства, з другога – яма – прасторавы вобраз, праз пасрэдніцтва якога героі Баршчэўскага пераходзяць ад крызіснай сучаснасці да таямнічай будучыні. І ў той жа час яма – чорная пастка, часавая пустата, неўтаймаваная і хаатычная, з якой і павінна нарадзіцца гармонія, у нашым кантэксце – новы горад. Улічыўшы семантычную шматзначнасць вобраза ямы, можна меркаваць аб трансфармацыі касмаганічных міфаў у гарадской міфалогіі Баршчэўскага. Магчымасць выкарыстання мадэлі касмаганічных матываў да матыву ўзнікнення горада абгрунтаваў М. Эліадэ ў манаграфіі "Аспекты міфа" [12].

[2] Эсхаталагічныя міфы, паводле тлумачэння Е. Меляцінскага, гэта міфы пра канец свету. Для архаічных міфалогій характэрна ўяўленне аб сусветнай катастрофе, якая аддзяляе міфалагічны час першастварэння ад сучаснасці – пра патоп, пра пажар, пра знішчэнне першых пакаленняў, веліканаў.

Міф пра стварэнне, паводле тлумачэння вучонага, сімвалізуе не проста пераўтварэнне прасторы з хаатычнай у касмічную, але і пачатак новага часу. Вобраз пустаты, у якой узнікае горад, на думку даследчыка, абазначае сімвалічнае чаканне новага і напаўненне яго сэнсам. Магчыма, таямнічая кабета ў творы Баршчэўскага таксама чакае новых спрыяльных часоў, калі народ не будзе так прагнуць багацця, а будзе ўшаноўваць гістарычнае мінулае, выправіць усе заганы крызіснай сучаснасці.

Шлях да абнаўлення – цэнтральны момант не толькі гарадскіх міфаў, але і ўласнай міфатворчасці Баршчэўскага, дзе адраджэнне бачыцца аўтару ў вяртанні да першапачатковай гармоніі, да даўно страчанага чалавецтвам стану. Героі апавяданняў "Успаміны пра наведванне роднага краю", "Летуценнік Севярын" паўсюль бачаць новую Аркадзію і ўтапічна вераць, што Залаты век, які быў у мінулым, павінен уладарыць на зямлі. Першапачаткова ідэалізацыя новай Аркадзіі вылучаецца ў эклогах Вергілія, дзе адбываецца яе міфалагізацыя і пераўтварэнне ў асаблівы свет, дзе ўладарыць Пан, гуляюць пастухі і не канчаецца вечная ўрачыстая вясна" [13, с. 12]. Пісьменнік, як і яго старажытны папярэднік, стварыў невялікія астраўкі для існавання Залатога веку, гэта добраўпарадкаваная гаспадарка рыбака Родзькі (апавяданне "Рыбак Родзька"), гэта і сядзіба шляхціца Завальні (апавяданне "Шляхціц Завальня") і ўладанні пана Зямельскага (апавяданне "Развітанне").

Частая ідэалізацыя вясковага жыцця стала састаўной часткай аўтарскага міфа, але пісьменнік не паслядоўны антыўрбаніст, які ўслед за Ж. Ж. Русо заклікаў чалавека жыць на ўлонні прыроды, хаця ў зборніку "Шляхціц Завальня" Ян Баршчэўскі часта супрацьпастаўляе вёску і горад. У "Нарысе Паўночнае Беларусі" яго герой бегла аглядае ваколіцы Рабшчызны і з вышыні Пачаноўскай гары бачыць бедныя вёсачкі, якія чарнеюць па схілах, але нідзе не заўважае ні велічных гмахаў, ні гарадскіх замкаў. Адсутнасць гарадскіх пабудоў у панарамным малюнку падабаецца аўтару. Ён з асаблівай цеплынёй ушаноўвае вясковых жыхароў, падкрэслівае іх салідарнасць у час як прыемных, так і жахлівых падзей. Аўгіня з апавядання "Кавалёва Аўгіня" стала кумой для ўсёй ваколіцы, паважаным кумам быў і Марцін з апавядання "Зухаватыя ўчынкі" – "чалавек пачцівы і гаваркі, рады кожнаму дапамагчы, таму і любіла яго ўся воласць…" [10, с. 113]. Не толькі цеплыня ўзаемаадносін збліжае людзей, вяскоўцы згуртоўваюцца і падчас незвычайнай сітуацыі, якая склалася ў апавяданні "Рада". Сяляне вярталіся з працы і пачулі захопніцкую песню д'ябла і амаль адразу жах скаваў людзей, яны пераўтварыліся ў інертную масу, толькі адзін смяльчак падумаў, што гэта асташ спявае і запусціў у яго каменем. Герой-адзіночка выступіў супраць зла, увасобленага ў жыхару іншай вёскі.

Пісьменнік паказаў, што зло прыходзіць ад чужых, здалёк, часта з горада. Так, пан прывёз з-за свету Арыну і яе дачку Алюту ("Зухаватыя ўчынкі») і вяскоўцы насцярожана да іх ставяцца. Недружалюбна адносяцца сяляне да былых гарадскіх жыхароў Праксэды і яе дачкі Варкі ("Радзімы знак на вуснах"), якія яшчэ і жывуць у карчме вёрст за шэсць ад вёскі. З трывогай у душы ўспрынялі героі апавядання "Пра чарнакніжніка і цмока…" з'яўленне чарнакніжніка ў маёнтку, які вучыў пана і яго пахолка Карпу розным шатанскім штучкам. Страшны вядзьмак, магчыма, таксама прыбыў з горада. Чарнакніжнік Твардоўскі, паводле міфалагізаванай гісторыі Баршчэўскага, жыве ў Полацку і спакушае вучняў, падштурхоўвае іх да граху.

У міфе пра Полацк горад мае амбівалентныя рысы. З аднаго боку, як патлумачыў Пятро Васючэнка ў "Крыўскім слоўніку, паводле Яна Баршчэўскага", "Полацак – першая сталіца Беларускае дзяржавы" [14, с. 24]. Пры ўспаміне пра Полацак, падкрэслівае вучоны, "згадваюцца незвычайныя людзі-асілкі, што жылі даўней у касмічна аддаленым часе" [14, с. 24]. У вачах шляхціца Завальні Полацак – цэнтр асветы, асяродак кніжнай навукі, з другога боку – ён жа і крыніца заразы, ад якой пашыраецца чарнакніжніцтва: "Пан Твардоўскі таксама атабарыўся ў Полацку, таму Завальня з павагай і адначасна з насцярогай ставіцца да вялікага ў ягоных вачах места і засцерагае пляменніка і сыноў ад гарадскіх спакусаў" [14, с. 24]. Перасцярогі Завальні небеспадстаўныя, можна дапусціць, што пан Твардоўскі выхаваў па логіцы зла шкаляра Люцэфугу і Гордага Філосафа. Першы з іх не любіў працаваць, жыў у вялікім горадзе, дзе пазнаёміўся з Аўрэліяй, такой жа лёгкадумнай асобай, як і сам. Пасля шлюбу маладыя жывуць у вёсцы, але і натуральнае вясковае быццё не выправіла сітуацыю, сямейная пара распалася.

Люцэфуга хутка страціў жонку, маёнтак, прыяцелі і знаёмыя здзекваліся з яго" [10, с. 302]. Люцэфуга знік і праз некаторы час з'явіўся ў Полацкім кляштары ў абліччы прусака, якога ўбачыў Музыка ў цёмным куце, ён выпаўз на сярэдзіну пакоя, спыніўся, пачаў надзімацца і расці. Пасля з-пад чорнай скарлупіны з'явілася чалавечая галава. Музыка пазнае Люцэфугаў твар; перапалоханы выпусціў з рук флейту, скочыў ад вакна, а сонечны прамень стрэліў праз шыбу на страшыдла, і яно імгненна знікла…" [10, с. 303].

Горды Філосаф, наадварот, адрозніваўся працавітасцю, начытанасцю і вучонасцю, але праца без Бога не дала яму добрых вынікаў. Ён пераехаў з горада ў вёску і стварыў уласную філасофію, гаварыў, што памерлым не патрэбны малітвы жывых, насміхаўся з праведнасці беларускага люду: "Па ўсім Полацкім павеце простыя людзі, апавядаючы пра гэта, адзін аднаму казалі, што Філосаф цяжка правініўся перад панам Богам. Ён лічыў, што чалавек – частка самога Бога, што душа яго, заглыбіўшыся ў даследаванні, разумее ўсе цуды, бачыць усе таямніцы…" [10, с. 305].

Горад у аўтарскім міфе Яна Баршчэўскага стаў паўнавартасным *пеклам:* з горада прывезлі ў дом пані Паручнікавай прыгожага катка ("Чараўнік ад прыроды і кот Варгін"), пад маскай якога хаваўся д'ябал, які наклікаў на людзей хваробы. У горадзе часта прападае чарнакніжнік Карпа ("Пра чарнакніжніка і цмока…"), баляваў там і канчаткова зліваўся з тлумным жыццём, а пасля пажару на сваім селішчы наогул знік. Адны меркавалі, што "ён злыгаўся з ліхадзеямі, якія пераганялі коней з Беларусі пад Пскоў, ці да Вялікіх Лукаў" [10, с. 109]. У вялікі горад пераязджае і Мальвіна ("Вогненныя духі") – гарадская выхаванка, якая сваім прагматычным бяздушшам згубіла Альберта, а сама "сярод шуму вялікага свету забылася пра мінулае…" [10, с. 109]. Горадам забыцця стаў і Вялікі Ноўгарад ("Русалка-спакусніца"), які "ўмураваўся непадступнымі мурамі", але моцныя гарадскія сцены былі толькі знешнім прыгожым абрамленнем, на фоне якога яшчэ больш ганебна выглядае здрада маладога паніча. Ён парушыў клятву быць верным у каханні і весела бавіць час з іншымі жанчынамі. Нават "белакаменны горад" не спыніў героя, а, наадварот, памножыў яго слабасці. Але горад не толькі разбуральны, Полацк і каханне Якуба Плаксуна пераўтварылі Варку ("Радзімы знак на вуснах"), якую працяглы час крыўдзілі аднавяскоўцы, кажучы, што дзяўчыну пацалаваў д'ябал і радзімка на вуснах – знак сувязі з нячысцікамі. Але, не баючыся гэтых нагавораў, Плаксун бярэ шлюб з Варкай. Дзяўчына стала жыхаркай Полацка, праславілася ветлівасцю і гасціннасцю. Дабрыня жанчыны зрабіла яе прыгожаю, як анёл. Велічны горад змяніў да лепшага і кабету Інсекту ("Драўляны Дзядок і кабета Інсекта"), якая, доўга жывучы ў сваім маёнтку, шмат грашыла. Зло высушыла цела жанчыны, яна стала падобнай да насякомага. Зваротнае ачалавечванне кабеты адбылося ў Полацкім кляштары, дзе паклалі дзіўнае стварэнне на галаву Сакрата. Ксёндз увесь час маліўся за душу Інсекты і адбыўся цуд: "з'явілася яна аднойчы ксяндзу ў пекным аблічччы, падобная да анёла, німб вакол чароўнага твару… Яна падзякавала за малітвы, клопаты дзеля яе і ў міг вока знікла…." [10, с. 296].

Грэшніцу выратавала вымоленае месца, сакральная чысціня і прысутнасць моцнага Духа ў сценах Полацкага кляштара. Шчырыя малітвы і праведнае жыццё пераўтвараюць зямны горад у святы. Сакральнасць Полацка ў велічнасці яго святыняў – "званоў св. Стафана, царквы святой Сафіі, якія, стоячы ў тумане, здаецца імкнуцца да воблакаў, іх постаці-веліканы пануюць над горадам і над усёй ваколіцай…" [10, с. 140].

Такім чынам, пры аналізе аўтарскага міфа пра горад раскрываецца адметнасць светабачання пісьменніка, які ідэалізуе вёску, лічыць, што ўсё прыроднае, натуральнае па-сапраўднаму гарманічнае і прыгожае. Горад, у мастацкай трактоўцы Баршчэўскага, – амбівалентны вобраз, сімвалічная шматзначнасць якога раскрываецца аўтарам праз выкарыстанне біблейскіх уяўленняў пра горад-Рай, горад-Пекла, горад-Чысцец.

Горад-Рай у міфапаэтыцы Баршчэўскага мае сімвалічнае напаўненне, як *час "людскога дзяцінства*" (Герой "Успамінаў пра наведванне роднага краю" ўсхвалёна заклікае: "О, шчаслівыя лятункі цудоўнага юнацтва. Калі маладыя, зямля – рай, усюды дзівосы" [10, с. 137]). Райскім для Баршчэўскага быў Полацк, дзе пісьменнік жыў у гады свайго юнацтва, але родны горад у міфатворчасці пісьменніка паказваецца і атрутна-пякельным, у ім жыве і множыць зло пан Твардоўскі (апавяданне "Пан Твардоўскі і вучань"), і блаславёна ачышчальным у час поўнага абнаўлення грэшніцы Інсекты (апавяданне "Кабета Інсекта).

Архетыпічныя моманты біблейскай гісторыі, як і язычніцкія архаічныя ўяўленні беларусаў, выкарыстоўваюцца ў аўтарскім міфалагізаванні і раскрываюць недасканаласць сучаснага стану ў свеце і надзею на новае абнаўленне, якое мысліцца пісьменнікам не як стварэнне новага, а як вяртанне да першапачатковай гармоніі.

Абнаўленне ў гарадскім міфе Баршчэўскага звязвалася, з аднаго боку, з ідэяй утапічнага вяртання Залатога веку, перапляталася з верай у натуральнага чалавека, у натуральную гаспадарку, з другога – раскрывалася ў непаслядоўных аўтарскіх спадзяваннях на горад як цэнтр асветы, культуры і высокай духоўнасці.

У гарадской міфалогіі, прадстаўленай у мастацкіх тэкстах Баршчэўскага, абавязковы наступныя элементы, якія бяруць пачатак у розных міфалагічных сістэмах: матывы страты памяці, падзеі здарэння, якое парушыла звычны ход гісторыі горада, і матыў канца гісторыі горада.

Страта гістарычнай памяці выступае прыкметай дэградацыі і заканамерна папярэднічае канцу гісторыі горада, з'яўляецца састаўной часткай эсхаталагічных міфаў, але трагізм эсхаталагічнай тэматыкі гарадскіх міфаў аблягчаецца матывам цыклічнасці, абнаўлення.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Падбярэскі, Р. Беларусь і Ян Баршчэўскі / Р. Падбярэскі // Баршчэўскі Ян. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. – Мінск: Юнацтва, 1996. – 319 с.

2. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі.– Мінск: Маст. літ., 1992. – 479 с.

3. Каваленка, В. А. Міфа-паэтычныя матывы / В. А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 318 с.

4. Хаўстовіч, М. В. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага / М. В. Хаўстовіч. – Мінск : БДУ, 2003. – 203 с.

5. Даніленка, С. І. Міф Адраджэння: харунжыя Бога. Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў беларускай літаратуры XIX–XX стст. у кантэксце інфернальнай вобразнасці / С. І. Даніленка. – Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2005. – 180 с.

6. Тычына, З. Сны і снабачанні Яна Баршчэўскага / З. Тычына. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 92 с.

7. Багдановіч, І. Біблейскі архетып возера ў інтэрпрэтацыі рамантыкаў (Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан) / І. Багдановіч // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай / рэдкал. Л. К. Тарасюк [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2000. Ч1: Тэарэтычныя праблемы літаратуразнаўства, міфалагічныя матывы і фальклорныя традыцыі ў літаратуры, славянскія літаратуры, ад сярэднявечча да асветніцтва, беларуская літаратура ў яе ўзаемасувязях з іншымі літаратурамі свету. – С. 13–17.

8. Бельскі, А. "О, горада чароўныя прынады!" Станаўленне ўрбаністычнага мыслення ў беларускай паэзіі / А. Бельскі // Роднае слова. – 2015. – № 3. – С. 17–18.

9. Медведева, Н. И. Миф как форма художественной условности: автореф. дис….канд. филол. наук / Н. И. Медведева. – М., 1984. – С. 1–2.

10. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі ; уклад., прадмова і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.

11. Вовк, О. В. Энциклопедия знаков и символов / О. В. Вовк. – М. : Вече, 2006. – 526 с.

12. Элиаде, М. Аспекты мифа: пер. с фр. / М. Элиаде. – М.: Академ проект, 2001. – 239 с.

13. Вергилий, П. Буколики / П. Вергилий // Публий Вергилий Марон. Буколики. Георгики. Энеида. – М., 1971. – 386 с.

14. Васючэка, П. Крыўскі слоўнік, паводле Яна Баршчэўскага / П. Васючэнка // Крыніца. – 1999. –№ 7– 8 (54). – С. 24–26.

## References

1. Padbiareski R., "Belarus and Ya. Borschevskiy", in Barshcheўski Ia., Shliakhtsits Zaval'nia, abo Belarus' u fantastychnykh apaviadanniakh [Nobleman Zavalnya, or Belarus in Fantastic Tales], Iunatstva, Minsk, BY, 1996, pp. 331–367.

2. Garetski M., Gistoryia belaruskae litaratury [The History of Belarusian Literature], Mastatskaia litaratura, Minsk, BY, 1992.

3. Kavalenka V.A., Mifa-paetychnyia matyvy [Mythical and Poetical Motives], Navuka i tekhnika, Minsk, BY, 1981.

4. Khaўstovich M.V., Mastatski metad Iana Barshcheўskaga [J. Barszczewski's Artistic Method], BDU, Minsk, BY, 2003.

5. Danilenka S.I., Mif Adradzhennia: kharunzhyia Boga. Spetsyfika satsyial'nai mifatvorchastsi ў belaruskai litaratury KhIKh – KhKh stst. u kantekstse infernal'nai vobraznastsi [The Renaissance Myth: God's Cornets. Specifics of Social Mythmaking in Belarusian Literature of the 19th – 20th Cent. in the Context of Infernal Imagery], MDU imia A. Kuliashova, Mogilev, BY, 2005.

6. Tychyna Z., Sny i snabachanni Iana Barshcheўskaga : managrafiia [J. Barszczewski's Dreams and Visions: A Monograph], Belaruski knigazbor, Minsk, BY, 2004.

7. Bagdanovich I., "Biblical Archetype of a Lake in Romanticists' Interpretation (A. Mitskevich, J. Chachot, T. Zan)", in Tarasiuk L.K. (ed.), Slavianskiia litaratury ў kantekstse susvetnai. Ch1. Tearetychnyia prablemy litaraturaznaўstva, mifalagichnyia matyvy i fal'klornyia tradytsyi ў litaratury, slavianskiia litaratury, ad siaredniavechcha da asvetnitstva, belaruskaia litaratura ў iae ўzaemasuviaziakh z inshymi litaraturami svetu [Slavonic Literature in the Context of World Literature/ Part 1. Theoretical Problems of Literary Criticism, Mythological Motives and Folk Traditions in Literature, Slavonic Literatures from the Middle Age to the Renaissance, Belarusian Literature in its Interaction with World Literature], BDU, Minsk, BY, 2000, pp. 13–17.

8. Bel'ski A., ""Oh, the City's Wonderful Lure!" Formation of Urban Thinking in Belarusian Poetry", Rodnae slova [Native word], 2015, no. 3, pp. 17–18.

9. Medvedeva N. I., "Myth as a Form of Artistic Convention", Abstract of Ph.D. dissertation, Theory of literature, Textual, Moscow Order of Lenin, Order of October Revolution and the Order of the Red Banner of Labor State University named after M. V. Lomonosova, Moscow, RU, 1984.

10. Barshcheўski Ia., Vybranyia tvory [Selected Works], "Belaruski knigazbor", Minsk, BY, 1998.

11. Vovk O.V., Entsiklopediia znakov i simvolov [Encyclopedia of Signs and Symbols], Veche, Moscow, RU, 2006.

12. Aspekty mifa [Aspects of the Myth], Translated by Eliade M., Lit. Izd. Agenstvo "Akadem proekt", Moscow, RU, 2001.

13. Vergilii Publii, Bukoliki. Georgiki. Eneida [Bucolic. Georgics. Aeneid], Khudozhestvennaia literature, Moscow, RU, 1971.

14. Vasiucheka Piatro, "Kryvian Dictionary according to Jan Barszczewski", Krynitsa [Source], 1999, no. 7–8 (54), pp. 24–26.

## Информация об авторе

*Леська Лилия Петровна* – ст. преподаватель. УО «Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка» (ул. Советская, 18, 220030, Минск, Республика Беларусь). E-mail : leska.1.5@yandex.ru.

## Information about the author

*Leska Liliya Petrovna,* Senior Lecturer, Belarusian Maxim Tank State Teachers-Training University (18 Sovetskaya Str., Minsk 220030, Belarus). E-mail: leska.1.5@yandex.ru.

## Для цитирования

Леська, Л. П. Міфалагічны ўрбанізм Яна Баршчэўскага / Л. П. Леська // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 2. – С. 99–105.

## For citation

Leska L. P. Jan Barszczewski's Mythological Urbanism. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 2, pp. 99–105.